# Молада, але не зялёна



Ігару Крывульку — 22. Ён скончыў Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў усяго два гады таму, а працуе ў Маладзёжным тэатры эстрады ўжо чатыры гады. Пачынаў мастаком па святле. Спачатку было цяжка, але нічога, справіўся. Потым перайшоў на стаўку рэжысёра-пастаноўшчыка. Гаворыць, што заўсёды хацеў працаваць па спецыяльнасці, ствараць мерапрыемствы і дарыць людзям свята.

Праца ў тэатры дае такую магчымасць. Яго залучаюць да стварэння мерапрыемстваў дзяржаўнага маштабу. У прыватнасці, Рэспубліканскага свята "Апошні званок", якое летась зрабілі ў фармаце шоу, з дыджэямі. Прыдумалі новую сцэну для гэтага. Свае трэкі там прадставілі Martwin, Zina Bless і Хелена Мерааі. У фармаце флэшмобу выступілі артысты танцавальнага балета Fusion. Найлепшыя выпускнікі краіны рэагавалі на гэта захоплена.

Ігар Крывулька лічыць, што моладзі цікава слухаць выканаўцаў, якія працуюць у актуальнай музычнай стылістыцы, і любіць выкарыстоўваць новыя тэхналогіі, сочыць за модай у тэхналогіях шоу і хоча ўкараняць новаўвядзенні ў рабоце. На ўласным досведзе ён пераканаўся: нават калі фінансаванне невялікае, арыгінальныя тэхнічныя навінкі і спецэфекты ўспрымаюцца публікай "на ўра".

Адказна Ігар Крывулька ставіцца да праектаў патрыятычнага характару. Нядаўна акцёры Маладзёжнага тэатра эстрады паўдзельнічалі ў тэлепраекце СТБ да 23 лютага. Задача была стварыць атмасферу ваеннага кіно. У працэсе яе выканання прыйшла ідэя перапрацаваць аранжыроўкі, зрабіць так, каб папулярныя песні з кінафільмаў аб вайне сталі сугучныя сённяшняму ўспрыманню. Ідэю ўвасобілі ў жыццё. Вынік атрымаў высокую адзнаку тэлегледачоў.

— Хачу стаць рэжысёрам дзяржспецмерапрыемстваў, — кажа малады дзеяч культуры. — Ужо напісаная канцэпцыя майго бачання, як арганізаваць канцэрт да 3 ліпеня (Дзень Незалежнасці Рэспублікі Беларусь), буду падавацца. Жадаю прыўнесці ў такія мерапрыемствы нешта новае. Думаю, гэта ў маіх сілах.